перавагамі, інакш гэта будзе ўжо не дэмакратыя («палітыя»), а бязглуздая і несправядлівая «охлакратыя», «улада натоўпу». Арыстотель таксама выступае з крытыкай сацыяльных праектаў, звязаных з абагульненнем уласнай маёмасці (2, с. 408 – 411). Ён кажа, што несправядлівасць мае свае карані не ў грамадскім стане (нават пры адсутнасці прыватнай уласнасці можна несправядліва дамагацца высокіх дзяржаўных пасадаў і прывілеяў), але ў душах людзей, у маральных адносінах паміж імі.

Што датычыцца прававых асноў справядлівасці, то ў дачыненні да іх Стагірыт разглядае негатыўны аспект гэтай катэгорыі, таму што прызначэнне законаў – змагацца супраць несправядлівасці. Пры гэтым маюцца на ўвазе як юрыдычныя законы (прыватныя, зафіксаваныя ў адпаведных кодэксах), так і маральныя (напісаныя, што інтуітыўна спасцігаюцца ўвогуле ўсім грамадствам). Несправядлівасць можа ўтварацца як добраахвотна, так і пад прымусам. У апошнім выпадку нясе адказнасць той, хто прымушае несвядомага суб'екта. Матывацыя дабраахвотнай шкоднасці звязана з маральнай заганай, няўстрыманасцю, недахопам разумнага сэнсу адносна той ці іншай з'явы рэчаіснасці. Напрыклад, сквапны чалавек чыніць несправядлівасць праз грошы, распусны – праз цялесныя асалоды, баязлівы – праз свой страх перад небяспекай.

Аднак і маючы розум, людзі могуць яго памылкова выкарыстоўваць, калі лічаць несправядлівы ўчынак дапушчальным ці ўвогуле, ці толькі для сябе асабіста, ў канкрэтных абставінах. Да несправядлівасці часцей маюць схільнасць людзі ў чымсьці выключныя сярод іншых: спрытныя, дужыя, багатыя і гэтак далей, асабліва тыя, хто ўжо мае вопыт беспакараных несправядлівых учынкаў. Каб пазбегнуць несправядлівасці, трэба людзей недобрасумленных стрымліваць праз пагрозу непазбежнай адпаведнай іх учынку кары, а ўвогуле – з маленства выхоўваць добры розум, шчырасць і добразычлівасць.

Разважанні Арыстоцеля на конт справядлівасці адлюстроўваюць грунтоўныя аспекты існавання прыватнай асобы ў межах дэмакратычнага соцыума. Хоць яны склаліся ў перыяд Антычнасці, але ў сутнасці сваёй ахапілі кагнітыўны вопыт усяго чалавецтва, арганічна ўвайшлі ў беларускую нацыянальную культуру.

*Літаратура*

1. Античные риторики – М., 1978. – 352 с.
2. Аристотель. Сочинения: В 4-х т. Т. 4.– М., 1983. – 830 с.
3. Падокшын С. А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI – XVII стст.– Мн., 2004. – 151 с.
4. Glosikova Ol'ga. Niektore teoreticke vychodiska noveho ponimania procesu vzdelavania sucasnej mladej generacie // Zbornik prac z teoreticko-metodickeho seminara.– Prešov, 2004.– S. 38 – 42.
5. Hoias duњy: Padrucnik ïyжciapraktyki relihijnaj dla bieiarusau (Uiaïyu K. Stepovič /Swajak K. /).– Rym, 1949.– 320 s.

*Аляксандр Сцепанцоў (Мінск)*

## Калектыўны суб'ект мастацкай культуры

У няспынным працэсе ўзнаўлення мастацкай культуры ажыццяўляецца мастацкая творчасць, яе забеспячэнне, рэалізацыя і рэфлексія, мастацкае выхаванне і адукацыя, рэстаўрацыя і захаваннее мастацкай спадчыны. У даным кантэксце носьбітам прадметна-практычнай дзейнасці, крыніцай і агентам актыўнасці з'яўляюцца стваральнікі

культуры, якія выступаюць як калектыўная сацыяльная супольнасць, сацыяльная арганізацыя, устойлівае аб'яднанне людзей на функцыянальна-дзейнай аснове і з адпаведнай спецыялізацыяй. Разглядаюцца не асобасныя, індывідуалізаваныя рысы спецыяліста культуры, яго творчая сутнасць, а ўмоўны функцыянальны калектыўны суб'ект мастацкай культуры ў відавай яе разнастайнасці.

Калектыўны суб'ект мастацкай культуры вызначаецца сваімі інавацыйна-творчымі, сацыяльна-арганізацыйнымі, інфармацыйна-камунікатыўнымі аспектамі. Ён з'яўляецца носьбітам вызначаных норм мастацкай дзейнасці, пазнання і калектыўнай свядомасці.

Мы засяроджваем ўвагу на вывучэнні і выяўленні прафесійна-адукацыйнага патэнцыялу і магчымых шляхоў удасканалення кадраў культуры. Гэта дазволіць выпрацоўваць кадравую стратэгію як важную дзяржаўную задачу. Вядома, што сур'ёзныя мэты (вызначэнне адказнасці дзяржавы за прадастаўленне кожнаму члену грамадства гарантаванага доступу да культурнай спадчыны, а таксама магчымасці займацца культурнай дзейнасцю, неабходнасці падтрымкі культуры як «перадумовы для палітычнага, эканамічнага і духоўнага развіцця грамадства і дзяржавы» [1, с. 8]) патрабуюць наяўнасці падрыхтаваных кваліфікаваных работнікаў. Бо ніякія сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў краіне немагчымыя без спецыялістаў новай генерацыі, без істотнага паляпшэння работы кадравых службаў устаноў культуры на аснове сучасных падыходаў у адборы, навучанні, выхаванні, атэстацыі, павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы работнікаў сферы культуры.

У нашы дні ставяцца пытанні задавальнення кадрамі ўстаноў культуры і грамадства ў цэлым, павышэння іх узроўню кваліфікаванасці для забеспячэння паспяховай дзейнасці; выяўляюцца заканамернасці творчага станаўлення спецыяліста культуры ў абазначанай сферы; вывучаюцца культурна-творчыя характарыстыкі спецыялістаў культуры, змест і вынікі іх сацыяльна-культурнай дзейнасці; асвятляюцца праблемы адпаведнасці высокага прызначэнне культуры і існуючай зараз сістэмы яе матэрыяльна-фінансавага забеспячэння; аналізуюцца перспектывы далейшага развіцця культуры, рынку культурных паслуг, пашырэння ўзроўню спецыяльнай адукацыі ў галіне культуры. Пералічаныя аспекты даследаванай тэмы з'яўляюцца актуальнымі і значнымі і патрабуюць навукова абгрунтаваных падыходаў.

У разуменні мастацкай культуры як часткі духоўнай культуры са складанай структурай асобае значэнне маюць яе суб'екты. *Мастацкая культура* вызначаецца як здольнасць грамадства ствараць, адэкватна ўспрымаць і ацэньваць мастацтва ўсіх відаў, родаў, жанраў; сукупнасць створаных мастацкіх каштоўнасцей, а таксама іх інтэрпрэтацый і ацэнак у літаратурна-мастацкай крытыцы, эстэтыцы і грамадскай думцы [2, с. 467]. Мастацкая культура характарызуецца як спосаб развіцця здольнасцей, талентаў, патрэб сацыяльнага суб'екта ва ўсіх формах мастацкай дзейнасці, ступень яго падрыхтаванасці да ўдзелу ў стварэнні і засваенні каштоўнасцей мастацтва, у арганізацыі мастацкай дзейнасці [3, с. 411]. Такое разуменне вельмі важнае, бо яно непасрэдна выводзіць да характарыстык кадраў культуры. Менавіта яны забяспечваюць функцыянаванне мастацкай культуры.

Сістэма кадраў сферы культуры мае прыкметы сацыяльнай арганізацыі: агульныя мэты, інтарэсы, каштоўнасці, нормы, сумесную дзейнасць. Змест дзейнасці суб'ектаў

культурнага працэсу вызначаны ў адпаведнасці з Законам аб культуры Рэспублікі Беларусь [4].

**Мэты** – стварэнне і распаўсюджванне разнастайных культурных дабротаў, задавальненне духоўных патрэб насельніцтва; спрыянне самаарганізацыі людзей для самадзейнай творчасці; падрыхтоўка і выхаванне ўзнаўляльнікаў-інтэрпрэтатараў актуальных культурных формаў і творцаў-распрацоўшчыкаў новых формаў.

Інтарэсы – імкнененне і праяўленне творчай дзейнасці ў культурна-асветнай ці тэатральна-відовішчнай сферы, з самастойным вызначэннем формы і зместу, жанру, мовы, стылю, годнасці і прызначэння ствараемых твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, рэпертуару выконваемых твораў, мовы, стылю і манеры выканання.

**Культурныя каштоўнасці** – створаныя (пераўтвораныя) спецыялістам матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя праяўленні яго творчасці, якія маюць мастацкі змест і сэнс.

**Нормы** – агульнадаступнасць культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ў дзяржаўных грамадскіх фондах; роўнасць суб'ектаў культурнай дзейнасці перад законам, недапушчальнасць устанаўлення пераваг і прывілей у галіне культуры, якія супярэчаць закону; арыентацыя на нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці, культурныя каштоўнасці (высокамастацкія і высокамаральныя).

**Сумесная культурная дзейнасць** – стварэнне, аднаўленне (адраджэнне), захаванне, вывучэнне, папулярызацыя, выкарыстанне і распаўсюджванне культурных каштоўнасцей, задавальванне інфармацыйных, культурных, навуковых запатрабаванняў; эстэтычнае выхаванне, мастацкая і культуралагічная адукацыя, арганізацыя культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.

Аснова сацыяльнай арганізацыі «кадры культуры» – спецыялісты культуры, якія вызначаюць яе змест, статусную характарыстыку. Стан і ўзровень функцыянавання ўстановы культуры, мастацкага калектыву ў многім абумоўліваюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, якія патрабуюць ад спецыялістаў адпаведных **здольнасцей** (прыродных схільнасцей і патэнцыяльных магчымасцей да пэўнага віду мастацкай творчасці); **адукаванасці** (валодання шырокай адукацыяй, рознабаковымі ведамі; інтэлігентнасці, культурнасці, выхаванасці); **кваліфікаванасці** (годнасці, падрыхтаванасці да мастацкай дзейнасці); **зацікаўленасці** (імкнення, скіраванасці на дасягненне творчых мэтаў); **актыўнасці** (дзейнасці, энергічнасці, рухомасці ў творчасці, зносінах).

Любая пасада ва ўстановах культуры мае шэраг службовых патрабаванняў, якія вызначаюць адпаведныя **функцыі** (кола дзейнасці, прызначэнне); **абавязкі** (сукупнасць спраў або даручэнняў, безумоўных для выканання); **адказнасць** (трымаць справаздачу пра ўласныя дзеянні і іх вынікі); **паўнамоцтвы** (магчымасць дзейнасці ў пэўных межах); **кампетэнцыі** (дасведчанасць, аўтарытэтнасць; наяўнасць пэўных правоў).

Сувязь пакаленняў, далучэнне дзяцей і моладзі да культурных традыцый, забеспячэнне культурных запатрабаванняў і зносінаў людзей, мастацкая творчасць – асноўныя сферы дзейнасці спецыялістаў культуры. Яны ажыццяўляюць найважнейшую функцыю культуры: вытворчасць каштоўнасцей культуры, іх зберажэнне, назапашванне і перадачу. І гэта не проста скіраванасць, а светаадчуванне, светапогляд, асабістае жыццё (душэўнае, эмацыянальнае) – у мастацкай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць кадраў культуры працякае ва ўстановах культуры, якія складаюць даволі развітую інфраструктуру сферы вольнага часу: гэта тэатры і філармоніі, музеі, клубы і дамы культуры, дамы і цэнтры народнай творчасці, рамёстваў, фальклору, народных традыцый, школы народнай творчасці, этнаграфічныя куткі, бібліятэчныя цэнтралізаваныя сістэмы. Існуе разгорнутая сістэма падрыхтоўкі кадраў культуры ў дзіцячых школах мастацтва, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах.

Сутнасць кадраў культуры якраз выяўляецца пры разглядзе ажыццяўлення чалавекам сацыяльна-культурнай дзейнасці – сацыяльна арыентаванай работы па выяўленні, захаванні, пашырэнні, асваенні і трансляцыі культурных каштоўнасцей, назапашаных пэўным грамадствам, этнасам, асобай [5, с. 66-67].

Кадры культуры забяспечваюць арганізацыю і напоўненасць сферы вольнага часу шматлікімі відамі і формамі сацыяльна-культурнай дзейнасці як у прафесійным, так і ў самадзейным мастацтве. Сацыяльна-культурная дзейнасць – сутнасная для спецыялістаў культуры, і імкненне выканаць пералічаныя функцыі становіцца асновай прафесіі з улікам пэўнай спецыялізацыі і адпаведнай кваліфікацыі. Таму самымі важнымі для выпускнікоў спецыяльных навучальных устаноў становяцца кваліфікацыйныя патрабаванні, якія дыктуе стандарт навучання пэўнай спецыяльнасці. Адпаведнасць ім вызначае дзяржаўны экзамен, па выніках якога дзяржаўная кваліфікацыйная камісія прысвойвае кваліфікацыю.

Да работнікаў сферы культуры прад'яўляюцца універсальныя патрабаванні прафесійнай кампетэнтнасці, асобасна-маральных якасцей, а таксама псіхасаматычнага здароўя (у т. л. знешней прывабнасці). Асаблівасці сферы культуры арыентуюць спецыялістаў на непасрэдную работу з людзьмі, на творчую дзейнаць з валоданнем публічнай імправізацыяй. Спецыяліст культуры павінен добра разбірацца ў пытаннях гісторыі культуры, культурнага жыцця, бягучай палітычнай сітуацыі. Акрамя таго, для работы з моладдзю неабходна мець педагагічную падрыхтоўку.

Даследаванні кадравай сістэмы ў сферы культуры апошніх гадоў дазваляюць засведчыць станоўчую дынаміку па многіх параметрах культурнага працэсу. Кадравы склад сферы культуры з'явіўся тым стрыжнем, які забяспечыў не толькі захаванне культурнай прасторы краіны, але і яе якаснае напаўненне. Ажыццяўлялася арганізацыя і запаўненне сферы вольнага часу шматлікімі відамі і формамі сацыяльна-культурнай дзейнасці як на прафесійнай, так і самадзейнай аснове. Кадры культуры выконваюць шматлікія функцыі, сярод якіх: культурная асвета, эстэтычнае і мастацкае выхаванне, правядзенне святочна-абрадавых мерапрыемстваў, ахова і выкарыстанне помнікаў гісторыі і культуры; арганізацыя вольнага часу (пазнавальнага, відовішчна-гульнёвага адпачынку), забеспячэнне рэкрэацыі і культурных зносін; развіццё мастацкай і прыкладной творчасці. Шырокае поле сацыяльна-культурнай дзейнасці патрабуе значнай прафесійнай адказнасці ад работніка культуры. Таму такое важнае значэнне надаецца менавіта ўзроўню адукацыі і якасным кваліфікацыям – асноўным характарыстыкам кадраў.

Апошнія пяць гадоў вызначаліся колькасным ростам пасад спецыялістаў усіх асноўных (самых масавых) устаноў культуры. За гэты перыяд павялічылася і колькасць абслужанага насельніцтва. Скарачэнне колькасці бібліятэк і клубаў было ўраўнаважана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павелічэннем агульнай колькасці спецыялістаў, што дало магчымасць пашырыць сферу паслуг у арганізацыі вольнага часу насельніцтва.

| Тыпы ўстаноў | Колькасць | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | устаноў | | | спецыялістаў | | | мерапрыемстваў, кнігавыдач (тыс.) | | |
| | 1996 г. | 2000 г. | 2004 г. | 1996 г. | 2000 г. | 2004 г. | 1996 г. | 2000 г. | 2004 г. |
| Бібліятэкі | 4800 | 4725 | 4263 | 9288 | 9802 | 9410 | 75808 | 76663 | 73748 |
| Клубы | 4234 | 4260 | 3867 | 9237 | 10699 | 10987 | 477 | 536 | 554 |

Разам з тым, трывала трымаецца колькасць супрацоўнікаў на пасадах спецыялістаў без спецыяльнай адукацыі: у бібліятэках звыш 8%, у клубах – 38,7%, павялічылася іх колькасць у тэатрах і канцэртных арганізацыях.

У цэлым у рэспубліцы ў культурна-асветных установах пераважаюць спецыялісты з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. У тэатрах, музеях інакш: там працуе 60% спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Такім чынам, можна сцвярджаць, што абраны курс на набліжэнне вышэйшай адукацыі да рэгіёнаў праз адкрыццё філіялаў ВНУ – гэта адзіна магчымы шлях выраўняць сітуацыю з падрыхтоўкай кадраў для ўстаноў культуры абласнога і раённага падпарадкавання. Гэта тычыцца перш за ўсё падрыхтоўкі спецыялістаў клубнай і бібліятэчнай справы, а таксама па музычнай і харэаграфічнай адукацыі.

Падсумоўваючы выкладзенае, неабходна зазначыць, што кадры культуры як сацыяльны калектыўны суб'ект актыўна і змястоўна ўплываюць на культурны працэс. Бессэнсоўна ўяўляць функцыянальныя элементы культуры – стварэнне каштоўнасцей і норм, іх захаванне і спажыванне – без людзей, аб'яднаных у супольнасць і скіраваных на культурна-творчую дзейнасць. Дзяржава, ажыццяўляючы культурную палітыку, зацікаўлена ў высокім прафесійным узроўні кадраў культуры, таму значная ўвага надаецца ўдасканаленню сістэмы адукацыі ў краіне, павышаюцца патрабаванні да адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў, уводзіцца іх матэрыяльнае стымуляванне ў залежнасці ад ўзроўню адукацыі, падтрымліваецца і патрабуецца сістэматычнае павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў і кіруючых работнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура*

1. Концепция национальной стратегии устойчивого развития Республики Беларусь. Национальная комиссия по устойчивому развитию Рэспублики Беларусь / Мн., 1996.– 39 с.
2. Конан У. М. Мастацкая культура. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал. І. П. Шамякін і інш.– Мн. : БелСЭ, 1984–1987.– Т. 3, с. 467.
3. Коган Л. Н. Художественное творчество и художественное воспитание – М. : Знание, 1979.– 63 с.
4. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» [Новая рэд. ] // Нац. реестр правовых актов Рэспублікі Беларусь.– 2004.– №87.– С. 7-22.
5. Грыгаровіч Я. Д. Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект.– Мн. : Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002.– 403 с.